

# Урок 109

Разгледзь, як выканалі дзяленне на двухзначны лік. Дапоўні разважанне.






1. **Першае няпоўнае дзялімае** — … . Значыць, у запісе дзелі будуць ... лічбы.
2. Дзялю 471 на 62. Для вызначэння выніку гэтага дзялення можна 47 падзяліць на 6. Атрымліваю 7.
   **Лічба ... — пробная**. Правяраю, ці падыходзіць яна. Множу … . Аднімаю … . Параўноўваю … . Лічба … падыходзіць. Запісваю першую лічбу дзелі — 7.
3. **Другое няпоўнае дзялімае** — … .
   Дзялю … на … . Для вызначэння выніку гэтага дзялення можна ... падзяліць на ... . Атрымліваю … .
   **Лічба ... — пробная**. Правяраю, ці падыходзіць яна. Множу … . Аднімаю … . Параўноўваю … . Лічба … падыходзіць. Запісваю другую лічбу дзелі — ... .
4. Чытаю адказ — … .

**1.** Вылічы і растлумач.

| | | |
|---|---|---|
| 782 : 34 | 3240 : 72 | 8215 : 31 |
| 768 : 24 | 1050 : 42 | 6996 : 53 |

**2.** Устаў прапушчаныя лікі.

| | |
|---|---|
| 829 : ? = 36 (аст. 1) | 3420 : ? = 16 (аст. 12) |
| 1430 : ? = 42 (аст. 2) | 7225 : ? = 23 (аст. 3) |

**3.** Вылічы.

| | |
|---|---|
| 10 мін + 59 мін | 22 г 31 мін + 19 г 42 мін |
| 26 с + 49 с | 37 мін 14 с + 29 мін 58 с |
| 4 г – 180 мін | 48 г 2 мін – 26 г 41 мін |
| 297 с – 4 мін | 45 мін 21 с – 28 мін 59 с |



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 109

**4.** Два веласіпедысты ехалі з аднолькавай скорасцю. Першы веласіпедыст быў у дарозе 6 г, а другі — 4 г. Колькі кіламетраў праехаў кожны з іх, калі першы праехаў на 32 км больш за другога?

**5.** За тры дні ў гандлёвым цэнтры пабывалі 11 875 пакупнікоў. У чацвер пакупнікоў было ўтрая менш, чым у суботу, а ў пятніцу іх было 3875. Колькі пакупнікоў наведалі гандлёвы цэнтр у чацвер? У суботу?



**6.** Састаў выраз, які будзе рашэннем задачы. Швачка Вольга можа прышыць за гадзіну $a$ каўняроў кашулі, а швачка Іна — $b$ каўняроў. За які час яны змогуць прышыць 90 каўняроў, працуючы разам?

**7.** Сума памяншаемага, аднімаемага і рознасці роўная 1024. Знайдзіце памяншаемае, аднімаемае і рознасць, калі рознасць меншая за аднімаемае на 88.

**?** Колькі лічбаў атрымаецца ў дзелі пры дзяленні ліку 1696 на лік 32?

**1.** Вылічы.

336 : 28 864 : 32 4088 : 73 5670 : 42

**2.** У двух вагонах было 125 600 кг грузу. На станцыі ў першы вагон пагрузілі яшчэ 3500 кг, а з другога выгрузілі 4200 кг. Колькі ўсяго кілаграмаў грузу стала ў двух вагонах?



Правообладатель Национальный институт образования



# Урок 110

**1.** Вылічы і растлумач.

544 : 34　　25 914 : 42　　393 254 : 83

636 : 53　　11 342 : 53　　312 871 : 41

**2.** Знайдзі значэнне выразу 347 844 : 6 : 7 + $a$ : 35, калі $a$ роўна 6335.

**3.** Знайдзі прапушчаныя лікі.

| Дзялімае | 542 | 746 | ? | ? |
|---|---|---|---|---|
| Дзельнік | 4 | 3 | 8 | 24 |
| Дзель | ? | ? | 216 | 607 |
| Астача | ? | ? | 7 | 12 |

**4.** Знайдзі:

- суму найбольшага чатырохзначнага ліку і найменшага пяцізначнага ліку;
- рознасць найбольшага шасцізначнага ліку і найменшага чатырохзначнага ліку.

**5.** Рашы ўраўненні.

456 + $x$ = 1264　　$y$ + 11 111 = 400 000

3045 – $c$ = 196　　$p$ – 197 588 = 802 412

**6.** Параўнай.

350 г + 460 г ? 1 кг　　1 кг – 650 г ? 150 г + 220 г

1 кг – 360 г ? 600 г　　1 кг – 990 г ? 670 г + 180 г

Як можна змяніць значэнні масы, каб у выніку параўнання атрымаліся правільныя запісы?



**7.** Вылічы.

453 т 460 кг : 4　　656 ц 88 кг : 4

34 км 455 м : 3　　35 м 25 см : 5



Правообладатель Национальный институт образования

## Урок 110



**8.** Складзі і рашы задачу.

<table>
<tr><th></th><th>Маса бульбы для пасадкі на 1 а, кг</th><th>Плошча ўчастка, а</th><th>Маса ўсёй бульбы, кг</th></tr>
<tr><td>Першы ўчастак</td><td rowspan="2">аднолькавая</td><td>?, на 2 большая</td><td>150</td></tr>
<tr><td>Другі ўчастак</td><td>?</td><td>90</td></tr>
</table>

**9.** У школьнай бібліятэцы на кожнай паліцы змяшчаецца па 90 падручнікаў матэматыкі або па 70 падручнікаў беларускай мовы. На паліцах змясцілася 450 аднолькавых падручнікаў, пароўну на кожнай. Якія падручнікі расставілі? Колькі спатрэбілася паліц?

**10.** Вася спускаўся з гары на горных лыжах 3 мін. Даўжыня спуску была 750 м. Казімір паспрачаўся з ім, што зможа спусціцца з гары хутчэй. Выберы, з якой скорасцю можа ехаць Казімір, каб перамагчы ў спрэчцы.

250 м/мін | 270 м/мін | 190 м/мін | 6 м/с

**11.** Начарці ломаную, даўжыня якой вылічваецца так:

25 мм · 3 + 30 мм · 2

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.
5796 + 52 608 : 64      38 850 : (378 : 9)

**2.** Адзін бусел ляцеў 5 мін, а другі — 8 мін. Адзін з іх праляцеў на 1800 м больш за другога. Колькі метраў праляцеў кожны бусел, калі іх скорасці былі аднолькавыя?



Правообладатель Национальный институт образования